# «Канстытуцыя Піліпа Орліка» выйшла па-беларуску




Нашыя паўднёвыя суседзі ўкраінцы называюць яе «Першай Канстытуцыяй Украіны» і нават першай Канстытуцыяй у Еўропе. Гэты знакавы гістарычны дакумент быў створаны яшчэ ў 1710 г. яркай асобай – гетманам Піліпам Орлікам, якому ўсталяваны прыгожы помнік у Кіеве, мемарыяльныя знакі ў розных месцах, яго іменем названыя вуліцы... Але не ўсе ведаюць – і ва Украіне, і ў Беларусі, што Піліп Орлік ураджэнец нашай зямлі. Ён нарадзіўся ў вёсцы Касута непадалёк Вілейкі. Так, аўтар «Першай Канстытуцыі Украіны» (арыгінальная назва «Устава правоў ды вольнасцяў Войска Запарожскага») – родам з Беларусі.

Ініцыятары выдання – Мінскае гарадское таварыства ўкраінцаў у Беларусі «Заповіт» і Амбасада Украіны ў Беларусі. Пераклад тэксту Канстытуцыі на беларускую мову выканаў Ягор Сурскі. Усе выдавецкія і паліграфічныя работы выкананыя ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Выхад унікальнага выдання супаў з часам, калі ва Украіне святкуецца Дзень Канстытуцыі.

***Алесь СУША,***
***намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі***

